

На адкрытай пляцоўцы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

# З Мінска — курс на Віцебск

у нашай гісторыі дэлегацыя Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі на чале з міністрам мастацтваў і культуры прыбыла ў Беларусь, а на "Славянскі базар у Віцебску" прыехаў ансамбль з ПАР у складзе 30-ці чалавек. Мяркую, віцябчанам пашчасціць паглядзець і ацаніць творчасць гэтага адметнага калектыву. З боку Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі мы атрымалі запрашэнне наведаць гэтую краіну і дамовіліся, што ў верасні 2008 г. мы не проста наведаем ПАР, а правядзём там Дні культуры Беларусі. Прымаючы бок прапанаваў, каб мы прыехалі з калектывам нашага тэатра балета. Яго высокі клас агульнавядомы далёка за межамі краіны. І хоць у ходзе гутаркі мы высветлілі, што народная творчасць Беларусі таксама вартая таго, каб яе ўбачылі на іншым кантыненце, мяркую, Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр балета годна прадставіць беларускае мастацтва ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы.

Пад час сустрэчы міністр культуры Беларусі даў згоду на правядзенне міні-фестывалю паўднёваафрыканскага кіно ў межах фестывалю "Лістапад".

**Падзяліцца ўражаннямі ад беларускай сталіцы, наогул нашай краіны, яе культуры карэспандэнт "К" папрасіў Пало Джордана.**

*— Я тут усяго некалькі гадзін, — заначыў міністр мастацтваў і культуры ПАР, — але першыя ўражанні ад Мінска*



# Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка — Беларусь: працяг дыялога

**У Беларусь прыбыў міністр мастацтваў і культуры Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Пало Джордан. 9 ліпеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася сустрэча з ім міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Матвейчука. Карэспандэнту "К" сталі вядомы папярэднія вынікі перамоў.**



Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Матвейчук і міністр мастацтваў і культуры Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Пало Джордан абменьваюцца сувенірамі.



Міністр мастацтваў і культуры Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі разглядае інтэр'еры бібліятэкі.

Візіт міністра з'яўляецца запланаваным крокам у развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ПАР: у 2006 годзе міністрам замежных спраў нашай краіны Сяргеем Мартынавым і міністрам мастацтваў і культуры ПАР Пало Джорданам было падпісана міжурадавае пагадненне ў сферы мастацтваў і культуры, і на сёлетняй сустрэчы з міністрам культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Матвейчуком былі абмеркаваны далейшыя крокі бакоў па рэалізацыі дакумента.

Дэлегацыя Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі прыбыла ў Беларусь 8 ліпеня. У яе складзе — 7 чалавек, у тым ліку Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі ў Расіі і Беларусі Бекі Ланга. Пад час візіту ў Мінск госці наведалі Нацыянальную бібліятэку Беларусі, Беларускую дзяржаўную філармонію, Нацыянальны мастацкі музей, Палац Рэспублікі. 11 ліпеня Пало Джордан прысутнічаў на адкрыцці "Славянскага базару ў Віцебску", у якім узяў удзел буйны фальклорны калектыў паўднёваафрыканскай краіны.

На сустрэчы дэлегацыі з міністрам культуры Рэспублікі Беларусь былі акрэслены прыярытэты культурнай палітыкі дзвюх дзяржаў і вызначаны магчымыя крокі далейшага супрацоўніцтва. Уладзімір Матвейчук адзначыў плённае развіццё ў апошнія гады Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", рэканструкцыю Нацыянальнага тэатра оперы і балета, вызначальную ролю вырашэння задач у сферы культуры і мастацтва, акрэсленых на III Усебеларускім народным сходзе і прыярытэты сённяшняй галіновай праграмы — кадры, тэатры, бібліятэчная справа, музеі, мастацкая творчасць, кінавідэапракат.



Пало Джордан знаёміцца з тэхнічнымі магчымасцямі бібліятэкі.



Пало Джордан пакінуў запіс у гасцявой кнізе Музея кнігі бібліятэкі.

Пало Джордан, у сваю чаргу, адзначыў, што галоўнай задачай для яго міністэрства мастацтваў і культуры ПАР сёння з'яўляецца дэмакратызацыя культуры. "Толькі 14 гадоў прайшло з той пары, калі грамадства нашай краіны было падзелена, — сказаў міністр. — У мінулым гэтая сітуацыя разглядалася трагічным чынам — сёння мы глядзім на гэтую старонку сваёй гісторыі як на блаславенне. І цяпер наша праблема заключаецца ў тым, каб пашырыць доступ да культурных здабыткаў нашай краіны для ўсіх слаёў насельніцтва, злучыць у адну нацыю "рознакаляровую стужку" народнасцей, што жывуць у ПАР".

Сярод прыярытэтных накірункаў культурнай палітыкі ПАР міністр мастацтваў і культуры Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі назваў ліквідацыю непісьменнасці насельніцтва, будаўніцтва бібліятэк. У прыватнасці, 1 жніўня Нацыянальная бібліятэка ПАР адкрые новыя плошчы. "Мы зацікаўлены ў развіцці сучасных тэхналогій, кінематографа, відэа як спосабаў самавыяўлення, — падкрэсліў Пало Джордан, — і ў будучым правядзенне фестывалю паўднёваафрыканскага кіно ў Беларусі падаецца нам магчымым". Прагучала і прапанова аб супрацоўніцтве паміж краінамі ў сферы сучаснага танца, музыкі.

— Сёння вельмі правільна было заўважана пад час перамоў, — падсумаваў вынікі знаёмства з Пало Джорданам Уладзімір Матвейчук, — для культуры няма межаў. Мы рыхтуемся да вялікага фестывалю "Славянскі базар ў Віцебску", выконваючы некалькі Даручэнняў Кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Рыгоравіч прапанаваў, каб на віцебскі фестываль запрашаліся творчыя калектывы не толькі з Беларусі, Расіі, суседніх краін, але і з іншых кантынентаў. У выніку перамоў у мінулыя гады быў падпісаны адпаведны дакумент, і сёння ўпершыню

*— гэта вельмі зялёны горад. Я б вельмі хацеў пабачыць старую частку горада, бо, прызнаюся, продкі маёй жонкі — з Мінска. Яе прабабуля нарадзілася тут, і таму жаданне ўбачыць стары Мінск для нас — цалкам натуральнае. Але я заўважыў, што ваша сталіца — сучасны горад, пасляваенная архітэктуры. Мне сказалі, што горад быў амаль цалкам разбураны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, і гэты факт мяне вельмі ўзрушыў.*

*Вельмі ўражвае ваша Нацыянальная бібліятэка. Тое, як яна пабудавана, яе дызайн, што дазваляе выкарыстоўваць дзённае святло. Гэта вельмі важна ў нашы дні, калі энергарэсурсы каштуюць дорага, і задзейнічанне натуральных энерганосьбітаў дазваляе эканоміць прыродныя багацці. Вельмі спадабалася і тое, як выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі, інтэрнет-сувязь. Нам расказалі пра тое, як можна паглядзець рэсурсы ў іншых частках свету, і, у прыватнасці, — мне быў паказаны мой артыкул, які знаходзіцца ў нашай бібліятэцы. Я спадзяюся, калі беларускі міністр культуры наведае Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку, ён здолее зрабіць тое ж самае — паглядзець свой артыкул у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, але — знаходзячыся ў нас.*

*Усе гэта гаворыць пра тое, што інфармацыйная рэвалюцыя дазваляе зрабіць свет значна меншым і наблізіць народы адзін да аднаго.*

*Уладзімір Матвейчук прэзентаваў Пало Джордану фаліянт "Спадчына Беларусі". У адказ міністр мастацтваў і культуры ПАР падарыў міністру культуры Беларусі альбом, які прэзентуе народныя рамёствы Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі.*

**Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ**
**Фота Юрыя ІВАНОВА**